*Л. Г. ЗАЙЦАВА*

# ПЫТАННІ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ ШКОЛЫ І СЯМ'І Ў ГІСТОРЫІ ПЕДАГОГІКІ

Бесперапыннасць і ўзаемасувязь працэсу фарміравання асобы падлетка прадугледжвае цэласны характар выхавання ў школе, у сям'і, у акаляючым сацыяльным асяроддзі. Актывізацыя і далейшае ўдасканаленне ўзаемадзеяння ўсіх інстытутаў выхавання, і асабліва школы і сям'і, застаецца і сёння надзённай задачай.

Праблема ўзаемадзеяння школы і сям'і ў пытаннях выхавання мае сваю гісторыю. Адзначым, што на працягу ўсяго перыяду свайго існавання айчынная педагагічная думка праводзіла ідэю аб значнасці сямейнага выхавання, аб неабходнасці цеснага супрацоўніцтва школы і сям'і. Варта, для прыкладу, нагадаць погляды С.Полацкага. Беларускі асветнік даказваў, што ўсё будучае жыццё чалавека вызначаецца перш за ўсё тым вопытам, які ён вынес з ранняга дзяцінства: звычкі, якія прывіла маці, і адказнасць, выпрацаваная бацькам,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з кожным годам умацоўваюцца і аказваюцца рашаючымі ва ўздзеянні на асобу. Ён раіў бацькам рабіць пастаянныя намаганні для таго, каб іх дзеці раслі добрымі. У выхаванні дзяцей С.Полацкі галоўную ролю адводзіў таму, якім прыкладам для дзіцяці з'яўляюцца настаўнікі і бацькі, а таксама акаляючаму асяроддзю. «...Не падаваць дзецям дрэннага прыкладу, бо як малпа, што бачыць зробленае людзьмі, у той жа час стараецца тое зрабіць, так і дзеці, якія бачаць справы сваіх бацькоў, бываюць іх пераемнікамі. ...Шчаслівыя бацькі, дабрачыннае жыццё якіх прыклад прыстойнасці для дзяцей, люстэрка для выпраўлення і ўзор добрых спраў. Няшчасныя ж нарадзіўшыя, якія спакушаюць сваіх дзяцей дрэнным жыццём: гэтыя людзі з'яўляюцца больш дзетазабойцамі, чым бацькамі...» [5].

Ідэя адказнасці бацькоў за выхаванне дзяцей гучыць у педагагічных выказваннях А.Я.Багдановіча: «Беларускі народ усведамляе значэнне выхавання як фактара, які ўздзейнічае на развіццё розуму і маральнасці, волі і характару, абумоўлівае паводзіны асобы: выхаванне дзяцей адносіць да асноўнага абавязку бацькоў і лічыць гэтых апошніх у пэўнай ступені адказнымі за іх учынкі" [1].

Думкі аб супрацоўніцтве школы і сям'і знайшлі сваё адлюстраванне ў педагагічнай журналістыцы пачатку XX стагоддзя. Так, з 1911 года стаў выходзіць часопіс Гродзенскай педагагічнай суполкі «Педагагічная справа». Часопіс выходзіў у дзвюх частках. Першая прысвечана настаўнікам і бацькам. Яе мэтай было садзейнічанне збліжэнню школы і сям'і ў вырашэнні задач выхавання. Другая частка была адрасавана непасрэдна вучням.

Выданні педтаварыства прапагандавалі ўсеагульную адукацыю, змяненне яе зместу, ставілі пытанні аб выхаванні вучняў. Часопісы імкнуліся вызначыць меры, якія маглі б палепшыць школьную справу: індывідуальны падыход да вучняў; удасканаленне падрыхтоўкі настаўнікаў; паляпшэнне выхавання ў сям'і і г.д.

Аб'ектыўнае патрабаванне часу — удасканаленне народнай адукацыі — не магло не трапіць на старонкі афіцыйнага часопіса «Народная адукацыя». У сувязі з гэтым у ім пачалі з'яўляцца артыкулы аб неабходнасці развіцця сістэмы адукацыі, узбагачэнні метадаў навучання, паляпшэнні сувязі школы з жыццём, супрацоўніцтве школы і сям'і і г.д. «...Пры ўсіх адрозненнях сям'і, школы і народа асноўная клетка гэтых устаноў нязменна адна: адзін і той жывы чалавек. Павінна быць адно і выхаванне...

У выхаванні, як у выключна штодзённай справе жывых людзей, узаемна выхоўваюцца і выхоўваюць выхаванец і выхавацель. Дзяленне па месцах сям'і, школы і народа хутчэй тэхнічны прыём, чым педагагічнае пытанне. Праўдападобней аднак пачынаць з сям'і, таму што непараўнальна цяжэй, калі гэта і магчыма, выпраміць стары крывы лес, чым выгнаць стройнае маладое дрэўца, гэта з аднаго боку, а з другога — у сямейным быце, і толькі ў ім адным, фізічна і псіхалагічна ствараецца і квітнее жыццё» [1].

У сумесным намаганні ўсіх сіл, якія прымаюць удзел у выхаванні падлеткаў, бачыла ўмову поспеху барацьбы за новую школу, яе ўмацаванне і раз-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

віццё Н.К.Крупская. Адводзячы школе першасную і важную ролю, яна вызначала яе як ведучае звяно ў справе навучання і выхавання падрастаючага пакалення. Адной з ідэй Н.К.Крупскай па пытаннях сувязі школы з акаляючым асяроддем было тое, што школа павінна стаць цэнтрам культурнага развіцця свайго мікрараёна. Гэта важная сацыяльная задача можа быць паспяхова вырашана толькі ў тым выпадку, калі школа стане «культурнай адзінкай», якая актыўна ўздзейнічае на жыццё ўсяго насельніцтва. А з другога боку, кожны, хто штосьці ўмее, павінен дапамагаць школе навучыць дзяцей таму, што ён ведае і ўмее сам. Гэта пашырыць магчымасці школы, дапаможа ў выхаванні маладых людзей.

Цеснае супрацоўніцтва школы і сям'і .К.Крупская лічыла жыццёва неабходным. Яна была адной з першых савецкіх педагогаў, якія прапанавалі ідэю адзінай выхаваўчай лініі. Пры гэтым яна падкрэслівала, што рашучае значэнне ў выхаванні дзяцей маюць не нейкія асобныя мерапрыемствы і метады, а ўвесь лад сямейнага жыцця [4].

Усебакова распрацоўваючы і прапагандуючы ідэю ўзаемасувязі школы і сям'і, Н. К. Крупская сцвярджала, што дзяржава не вызваляе бацькоў ад клопату пра дзяцей, яна толькі рэгулюе гэты клопат, накіроўваючы яго ў пэўнае рэчышча і ўсяляк дапамагае бацькам у выхаванні. Яна заклікала ўзбройваць бацькоў педагагічнай тэорыяй, якая б уключала тэорыю выхавання, узроставую педагогіку, заснаваную на дадзеных дзіцячай псіхалогіі. Н.К.Крупская вызначыла шляхі разгортвання педагагічнай прапаганды: выданне кніг, брашур, часопі-саў для бацькоў, арганізацыю «бацькоўскіх універсітэтаў», правядзенне занятказ і педагагічных кансультацый у школах для дарослых.

Пытанні сумеснай дзейнасці школы і сям'і па выхаванні падрастаючага пакалення займалі вядучае месца і ў педагагічнай дзейнасці С.Т. Шацкага, П.П. Блонскага.

Праводзячы думку аб тым, што выхаванне дзяцей школа адна здзяйсняць не можа, С.Т.Шацкі падкрэсліваў, што апошняя «павінна не адыходзіць ад сям'і, а пабудаваць план работы з ёю, і задача заключаецца ў тым, каб далучыць сям'ю да сумеснай працы са школай, знайсці шляхі сумеснай работы, шляхі да шырокай педагагічнай працы разам з тымі масамі, якія ўсё роўна гэтай справай займаюцца» [7]. Гаворачы аб неабходнасці далучэння сям'і да сумеснай працы, С.Т. Шацкі зазначаў: «Працаваць разам, значыць, добра ведаць адзін аднаго, знаходзіць і ставіць агульныя задачы, знаходзіць выхаваўчыя магчымасці, выкарыстоўваць для гэтага ўсе сілы і сродкі, якія мае асяроддзе, распрацоўваць метады сумеснай працы і ўмець пабудаваць такі план, які вывеў бы школу за межы яе сцен, абапіраўся б на тое, што сапраўды патрэбна жыццю» [7].

Выступаючы за ліквідацыю «адасаблення школы ад жыцця», П.П.Блонскі сцвярджаў, што школа пойдзе ў сям'ю, а сям'я ў школу, і настаўнік стане родным для бацькоў і вучняў. Зараз у настаўніка няма ўжо ніякіх апраўданняў для адасаблення ад насельніцтва [2].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ён падкрэсліваў педагагічную каштоўнасць здаровай сям'і, прадугледжваў напрамкі для яе аздараўлення ў педагагічных адносінах. Каб пазбегнуць памылак у сямейным выхаванні, школа павінна праводзіць работу з бацькамі па сумеснаму выхаванню дзяцей не эпізадычна, а пастаянна, рэгулярна. У гэту работу трэба ўнесці нейкую сістэму, нейкі план, і настаўніку трэба ведаць, што выхаванне дзяцей яго школы яму аднаму не пад сілу, трэба звярнуцца за дапамогай і гэту дапамогу арганізаваць.

Як адзначыў у сваім даследаванні Д.Ц.Вахоўскі, у 30-40-я гады тэарэтычныя аспекты ўзаемадзеяння школы і сям'і ў выхаванні вучняў атрымаі сваё далейшае развіццё [3]. У савецкай педагогіцы поўнасцю ўсталявалася ідэя адзінства школьнага і сямейнага выхавання. Яна знайшла сваё адлюстраванне ў працах А.С.Макаранкі, В.А.Сухамлінскага. У прыватнасці, у педагагічнай спадчыне В.А.Сухамлінскага школьна-сямейнае выхаванне разглядаецца як сумесная дзейнасць школы і сям'і ў выхаванні падрастаючага пакалення. Такое выхаванне не толькі дазваляе правільна выхоўваць маладое пакаленне, але і адначасова з'яўляецца галоўнай умовай удасканалення маральнага аблічча сям'і, бацькі і маці. «Без выхавання дзяцей, без актыўнага ўдзелу бацькі і маці ў жыцці школы, без пастаянных духоўных зносін і ўзаемнага духоўнага ўзбагачэння дарослых і дзяцей немагчыма сям'я як першасная ячэйка грамадства, немагчыма школа як важнейшая вучэбна-выхаваўчая ўстанова і немагчымы маральны прагрэс грамадства...»[6].

В.А.Сухамлінскі акцэнтаваў увагу на тым, што школа, як асобнае звяно ў выхаванні, павінна весці за сабой сям'ю, садзейнічаць правільнаму выхаванню дзяцей, падлеткаў, юнакоў, пастаянна клапаціцца аб педагагічнай культуры бацькоў. Без гэтага немагчыма рашэнне ніводнай задачы навучання і выхавання.

Такім чынам, аналіз літаратуры дазваляе гаварыць аб тым, што вядучае месца ва ўзаемадзеянні школы і сям'і прызнавалася за школай; праца з бацькамі павінна насіць сістэматычны характар, а не зводзіцца да розных мерапрыемстваў (ад выпадку да выпадку). Прадугледжваліся і канкрэтныя формы працы з бацькамі: бацькоўскія універсітэты, школы дарослых, педагагічныя кансультацыі, лекцыі для бацькоў, гутаркі, індывідуальная праца з сям'ёй, выданне кніг, брашур, часопісаў для бацькоў і г.д.

***Літаратура:***


1. Антология педагогической мысли Белоруской ССР. — М.: Педагогика, 1996.
2. *Блонский П.П.* Трудовая школа. Избр.пед. соч.; В 2-х т. — М.: Педагогика, 1979. Т.1.
3. *Ваховский Д.Ц.* Развитие взаимодействия школы и семьи в воспитании учащихся (1917-1945г.): Автореф. дис... канд.пед.наук: 13.00.01. — М., 1987.
4. *Крупская Н.К.* Семья и школа. Пед.соч. в 6-ти т. — М., 1978.-Т.5.
5. *Полоцкий С.* Обед душевный и вечеря душевная. Хрестоматия по истории педагогики. — Мн., 1971.
6. *Сухомлинский В.А.* Павлышская средняя школа.— М.: Просвещение, 1969.
7. *Шацкий С.Т.* Школа и строительство жизни. Пед. соч.: в 2-х т.Т. 2 — М., 1964.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова